**Д. Д. Паўлавец**
Факультэт давузаўскай падрыхтоўкі,
кафедра давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі

# ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНЫЯ ПАДЫХОДЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ НЯПРОФІЛЬНЫМ ДЫСЦЫПЛІНАМ

Паколькі глабалізацыя працягвае ставіць перад нашай краінай новыя задачы, кожнаму грамадзяніну спатрэбіцца валоданне шырокім колам кампэтэнцый, каб гнутка дастасавацца да хуткаплыннага, зменлівага ўзаемазвязанага свету. Адукацыя, якая мае сацыяльную і эканамічную ролю, займае ключавое месца ў засваенні грамадзянамі асноўных кампетэнцый, неабходных для таго, каб яны былі здольныя хутка прыстасавацца да разнастайных зменаў. Немалаважнае месца ў гэтым працэсе належыць гуманітарнай асвеце. Як вядома, мэта гуманітарнай асветы заключаецца не толькі ў перадачы студэнту сукупнасці ведаў, уменняў і навыкаў у пэўнай галіне навукі, але і развіццё агульнага кругагляду, міждысцыплінарнага адчування, здольнасцяў да індывідуальных творчых паняццяў, прыняцця самастойных рашэнняў, да самаадукацыі, да фармавання агульначалавечых каштоўнасцей. Усё гэта накладвае свой адбітак на выкладанне агульнаадукацыйных дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу. На жаль, апошнім часам склалася такое памылковае уяўленне, быццам бы гуманітарны цыкл не патрэбны ні фізіку, ні матэматыку, ні біёлагу, ні геолагу, ні правазнаўцу, ні філолагу-замежніку. Карацей кажучы, гуманітарныя дысцыпліны пераведзены ў разрад няпрофільных. Шкада, што сярод гэтых дысцыплін апынулася “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”. І гэта тады, як, згодна з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, беларуская мова – адна з дзяржаўных моў нашай краіны.

Таму выкладчыкі вымушаны шукаць новыя шляхі і падыходы да



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

навучання названых прадметаў. Укараненне і шырокае выкарыстанне новых формаў і метадаў навучання (трэнінгі, практыкум, групавая праца, праектныя метады і інш.) ажыццяўляецца дзякуючы новым падыходам да забеспячэння запатрабаванай і вызначанай працадаўцам якасці падрыхтоўкі. Наспеў час адыходу ад традыцыйных формаў навучання, якія склаліся на прынцыпах, сфармуляваных яшчэ Я.А. Коменскім, і якія дагэтуль пераважаюць у вну: семінарскія заняткі або лекцыя, прысвечаныя аднаму прадмету, тэме.

Традыцыйная сістэма – аднастайная, неварыятыўная, яна пазбаўляе права на свабоду выбару як выкладчыка, так і студэнта. Планаванне зместу адукацыі цэнтралізавана, базісныя навучальныя планы грунтуюцца на адзіных для краіны стандартах. У іх вызначаны своеасаблівыя калідоры, якія дазваляюць выкладчыку вучыць, не выходзячы за межы дазволенага, а студэнту вучыцца. Засваенне ведаў будуецца на: а) паведамленні гатовых ведаў, б) навучанні паводле ўзору, в) індуктыўнай логіцы ад прыватнага да агульнага, г) вербальным выкладанні; д) рэпрадуктыўным аднаўленні. Безумоўна, традыцыйныя формы маюць свае дадатныя (сістэматычнасць, упарадкаванасць, уздзеянне асобы выкладчыка і інш.) і адмоўныя бакі (аднастайнасць, нагрузка на хатнія заданні, абмежаваныя магчымасці самастойнага мыслення, адсутнасць індывідуальнага навучання). Усё гэта вымагае ўкаранення ў навучальны працэс вну новых формаў навучання, якія адпавядалі б запатрабаванням часу і рынку паслуг. Адной з такіх форм адукацыі з'яўляецца практыка-арыентаванае навучанне, у якім разумна спалучаюцца прынцыпы фундаментальнай адукацыі і прафесійна-прыкладной падрыхтоўкі. Укараненне яго ў навучальны працэс абумоўлена неабходнасцю пошукаў адэкватных тэхналогій – сукупнасці сродкаў і метадаў навучання і развіцця студэнтаў, якія даюць магчымасць паспяховай рэалізацыі вызначаных мэт. Сучасныя працадаўцы разглядаюць веды, уменні і навыкі выпускнікоў паводле здольнасці эфектыўнага практычнага прымянення, задавальнення стандартам якасці рынку паслуг.

Адзін са шляхоў вырашэння дадзенай праблемы – рэалізацыя практыка-арыентаванага падыходу. У прафесійным навучанні ён накіраваны на набліжэнне адукацыйнай установы да патрэб практыкі, стварае ўмовы для мэтанакіраванага фарміравання канкурэнтназдольнасці будучых працаўнікоў. Неабходна помніць і тое, што адной з ключавых кампетэнцый, вылучаных Балонскім працэсам, на першым месцы стаіць *камунікацыя на роднай мове***.** Паўтаруся, для Беларусі – гэта яшчэ і адна з дзяржаўных моў. Да таго ж, выпускнікам вну неабходна помніць, што з 22. 01. 2012 года ўступіў у сілу Закон "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб", які ўтрымлівае патрабаванне,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

каб адказы накіроўваліся заяўніку на мове звароту (беларускай або рускай), што вымагае ад выкладчыкаў і студэнтаў прыкладання агульных намаганняў для добрага авалодвання беларускай мовай. Гэта важна і таму, што веданне мовы дапаможа ў будучым паспяховаму жыццю і выкананню сваіх службовых абавязкаў, павышэнню пісьменнасці. Камунікацыя на беларускай мове выпрацуе ў студэнтаў здольнасць выяўляць і разумець паняцці, думкі, пачуцці, факты і выкладаць іх у вуснай і пісьмовай форме, будзе садзейнічаць развіццю пазнавальных здольнасцяў індывіда, яго ўменню тлумачыць сусвет і мець зносіны з іншымі. Камунікацыя на беларускай мове будзе садзейнічаць веданню слоўніка, функцыянальнай граматыкі і функцый мовы. Важна прывіць студэнтам неабходнасць вывучаць мову нефармальна, дзеля атрымання заліку, а як практычную неабходнасць для будучай працы. На занятках у студэнтаў выпрацоўваецца дасведчанасць аб асноўных тыпах вербальнага ўзаемадзеяння, аб шэрагу літаратурных і нелітаратурных тэкстаў, аб асноўных рысах розных стыляў і ўзроўняў мовы, а таксама аб варыятыўнасці мовы і камунікацыі ў розных аспектах. Студэнты павінны авалодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі і адаптаваць яе да патрабаванняў сітуацыі. Не апошнюю ролю адыгрывае і ўменне адрозніваць і выкарыстоўваць розныя тыпы тэкстаў, каб шукаць, збіраць і апрацоўваць інфармацыю, фармуляваць і выяўляць свае вусныя і пісьмовыя аргументы пераканаўчым чынам. Важна выпрацаваць у студэнтаў станоўчае стаўленне да камунікацыі на беларускай мове, гатоўнасць да крытычнага і канструктыўнага дыялогу, павагу эстэтычных якасцяў і жаданне да іх імкнуцца, а таксама цікавасць да ўзаемадзеяння з іншымі. Мова – гэта і шлях да пазнання нацыянальнай беларускай культурнай спадчыны, вызначэння яе месца ў свеце. Адным з шляхоў вырашэння дадзенай праблемы і з’яўляецца рэалізацыя практыка-арыентаванага падыходу. У прафесійным навучанні ён накіраваны на набліжэнне адукацыйнай установы да патрэб практыкі і стварае ўмовы для мэтанакіраванага фармавання канкурэнтназдольнасці будучых працаўнікоў. Асноўная мэта практыка-арыентаванага падыходу – пабудаваць аптымальную мадэль, якая спалучае выкарыстанне тэарэтычных ведаў для вырашэння практычных пытанняў, звязаных з фармаваннем прафесійных кампетэнцый спецыяліста.

Усё вышэй сказанае патрабуе ад выкладчыка беларускай мовы пошуку новых метадаў і шляхоў навучання. Безумоўна, пры гэтым неабходна ведаць меру, каб не перабраць, як кажуць. Так, напрыклад, на семінарскіх занятках з эканамістамі і юрыстамі як адзін з эфектыўных сродкаў выкарыстоўваецца дыскусія – мэтанакіраваны і ўпарадкаваны абмен ідэямі, меркаваннямі, думкамі. Яна накіравана на рэалізацыю

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

канкрэтна-змястоўных і арганізацыйных задач. Першыя дапамагаюць асэнсаваць раней атрыманыя веды, творча пераасэнсаваць і актуалізаваць мажлівасці выкарыстання атрыманых як спецыяльных, так і моўных ведаў. Другія садзейнічаюць выпрацоўцы правіл паводзін і працэдур сумеснага абмеркавання, узгаднення пры абмеркаванні праблемы. Для правільнага правядзення дыскусіі важныя выбар тэмы, выдзяленне праблемных пытанняў, падбор матэрыялаў, якія неабходна засвоіць, вызначэнне кола дакладчыкаў ці экспертаў, падрыхтоўка інфармацыйных матэрыялаў, правядзенне "мазгавога штурму", выпрацоўка правіл. Таксама неабходна ўлічваць час, мэту, вынік. Дыскусія пачынаецца з прамовы вядоўцы, які раскрывае асноўныя моманты тэмы і вызначае пытанні для абмеркавання. Формы дыскусій могуць быць разнастайныя. Для іх найбольш прымальны круглы стол і "мазгавы штурм". Пры круглым стале вядзецца размова, у якой на роўных удзельнічаюць невялікія групы студэнтаў і паслядоўна абмяркоўваюць вылучаныя праблемы. Пры "мазгавым штурме" група разбіваецца на мікрагрупы і спачатку вылучае ідэі для вырашэння прапанаванай праблемы, а пасля абмяркоўвае пастаўленыя пытанні.

У свой час на юрыдычным факультэце ў якасці адной з формаў паспяховага авалодання беларускай мовай і замацавання ведання беларускай юрыдычнай тэрміналогіі праводзіўся семінар-судовае паседжанне. Для яго быў падрыхтаваны сцэнарый на тэму "Віртуальнае забойства", затым размеркаваны ролі паміж удзельнікамі судовага працэсу, нарэшце праведзена судовае паседжанне з удзелам суддзі, прадстаўнікоў пракуратуры, адвакатаў, пацярпелых і падсуднага. Усе ролі выконвалі студэнты першага курса юрыдычнага факультэта. Падчас правядзення семінара-судовага пасяджэння яны імкнуліся да максімальнага выкарыстання прафесійнай лексікі з засвоенага на працягу семестра тэрміналагічнага мінімуму. Такія заняткі накіраваны на тое, каб выпрацаваць у будучых юрыстаў уменне і навыкі, калі гэта спатрэбіцца, наладзіць судовае паседжанне па-беларуску, эфектыўна выкарыстоўваць іх на практыцы, задавальняць стандартам якасці рынку паслуг. Гэта дае студэнту магчымасць аднаўляць вывучаны матэрыял, адказваць на дадатковыя пытанні, выкарыстоўваць асобныя матэрыялы, не толькі прапанаваныя ў пытаннях да практычных, але і адсутныя ў іх. Ён актыўна ўдзельнічае ў практычных, задае пытанні, прыводзіць прыклады, выказвае свой пункт погляду, сваю пазіцыю. Такім шляхам засвойваецца вучэбны матэрыял, выпрацоўваюцца маўленчыя навыкі, уменне аналізаваць, дыскутаваць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ